Смирнов // Восьмая научная конференция по проблемам книговедения : тезисы докладов. – М. : РКП, 1996. – 392 с.

12. Соловьев В. И. Электронная книга ставит вопросы перед книговедением / В.И.Соловьев // Восьмая научная конференция по проблемам книговедения : тезисы докладов. – М. : РКП, 1996. – 892 с.

13. Советский энциклопедический словарь. – М. : Советская энциклопедия, 1980. – 1600 с.

# КНІГА І ЯЕ МЕСЦА Ў СІСТЭМЕ КУЛЬТУРЫ

***Крукоўскі Мікалай Ігнатавіч,*** *прафесар, доктар філасофскіх і кандыдат філалагічных навук*

Культура перажывае сёння складаны перыяд. Некаторыя даследчыкі схільныя, і не без падставы, разглядаць яго як сур’ёзны крызіс. Пераважна гэта адносіцца да культуры духоўнай, дзе і неабходнасць кнігі як носьбіта набыткаў чалавечага духу падвяргаецца сёння сумневу. Напрыклад, канадскі культуролаг М. Маклюэн рызыкуе сцвярджаць, што кніга ўвогуле аджыла ўжо свой век і што, як ён піша, галактыка Гутэнберга схіляецца ў нашыя дні да захаду за гарызонт, саступаючы месца такім чыста візуальным тэхніка-інфармацыйным фактарам, як кіно, тэлебачанне і камп’ютэрны дысплэй. Але ці не занадта рана выкідаць кнігу, як кажуць, “на сметнік гісторыі”?

Культура сапраўды перажывае нялёгкія часы. І не толькі ў нас на Беларусі ці на тэрыторыі былога СССР, а і на агульнаеўрапейскім абшары. Пра гэта пісалі О. Шпенглер, А. Тойнбі, П. Сарокін і інш. (нямала пісалася адносна культуры мастацкай, дарэчы, і ў нас на Беларусі). Але ў культуры прысутнічаюць не толькі пераменлівыя, але і вельмі ўстойлівыя адносна часу фактары, да ліку якіх, безумоўна, адносіцца кніга [1]. Кнігу ў поўным сэнсе гэтага слова можна было б назваць падмуркам культуры. Яна ляжыць у аснове як самага высокага, духоўнага паверху сацыякультурнага будынка, які называецца рэлігіяй, так і навукова-тэхнічнага яго фундаменту, мяжуючы ўжо непасрэдна з культурай матэрыяльнай. Кніга і цяпер з’яўляецца асноўным матэрыяльным носьбітам таго, што ўвасабляе ў сабе ўсю сукупнасць найбагацейшых духоўных каштоўнасцей культуры ў цэлым. Пра гэта сведчыць сама этымалогія слова “кніга”, аб якой нямала дыскутавалі такія выдатныя лінгвісты, як А. Прэабражэнскі, М. Фасмер, П.Я. Чарных, А. Брукнер і інш. Само слова “кніга” паводле свайго паходжання звязана з элітна- сацыяльнымі пластамі грамадства. Некаторыя з гэтых лінгвістаў супастаўлялі, напрыклад, слова “кніга” з старажытна-скандынаўскім словам kenning (пазнанне, вучэнне) і старажытна-кітайскім king (у пазнейшым вымаўленні

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

цзін (Шы-цзін)), што азначала таксама кнігу.

Аднак галоўнае ў тым, што, як носьбіт інфармацыі, кніга найцяснейшым чынам звязваецца з мовай, якую К. Маркс справядліва называў матэрыялізаваным, ператвораным у рэчыўную форму розумам. Прычым розумам, што перажыў матэрыялізацыю двойчы: у форме гукавога слова як фанетычнага сімвала і пісьмовага знака-слова. Менавіта таму кніга мае такое гістарычнае пастаянства і ўстойлівасць, вельмі павольна змяняючыся ў сваім матэрыяльным увасабленні на працягу вякоў. У працэсе свайго развіцця кніга змяніла як найменш тры формы знешняга выгляду: глінянай таблічкі, папірусавага скрутку і, нарэшце, сшытка з папіруса, пергамену ці паперы. Цікава, што такой самай устойлівасцю адносна гістарычнага прагрэсу характарызуецца і пісьмовая мова ў параўнанні з жывой гаворкай. Дастаткова параўнаць, напрыклад, англійскую пісьмовую мову з фанетычнай. Там сапраўды, як жартуюць самі англічане, пішацца "Канстанцінопаль", а чытаецца "Лондан". А ў кітайскай мове пісьмо звязваецца ўжо не з гукам, а са зрокавым знака-вобразам, што паходзіць ад піктаграфічнага сімвала-малюнку. Гэта таксама па-свойму падмацоўвае пастаянства і ўстойлівасць кнігі як матэрыяльнага носьбіта пісьмовай мовы (у тым самым Кітаі, напрыклад, грамадскасць палічыла за лепшае захаваць усю найбагацейшую старажытную і сярэднявечную кніжную культуру зафіксаванай пры дапамозе надзвычай цяжкай і нязручнай іерагліфічнай сімволікі замест таго, каб замяніць яе сучаснай сімволікай літарна-фанетычнага тыпу).

Але было б памылкаю абсалютызаваць гэтую ўстойлівасць кнігі. Як і ўсё ў культуры і наогул у жыцці, кніга змяняецца. Як культура ў цэлым развіваецца ў ходзе дыялектычнага ўзаемадзеяння сваіх супярэчлівых бакоў, так і кніга, як бы адлюстроўваючы агульны складаны працэс, выразна дэманструе на сабе яго паасобныя фазы. Пачынаючы з антычных часоў, а пазней у працах Віка, Гегеля, О. Шпенглера, А. Тойнбі, П. Сарокіна і іншых, адзначалася, што ўся культура перажывае ў сваёй гісторыі такія перыяды-цыклы, праходзячы праз фазы пад'ёму, росквіту, упадку і заключнага крызісу як пераходу да чарговага цыклу, да наступнай сацыякультурнай эпохі. Прычым выразна назіраецца і ўнутраная структура гэтых фаз. Так для фазы пад'ёму культуры характэрная перавага духоўна-ідэальнага над пачуццёва-матэрыяльным. Гэта перыяд, калі кніга даражэй для чалавека, чым побытавая рэч. У фазе росквіту духоўна-ідэальнае і пачуццёва-матэрыяльнае ўраўнаважваюцца ў гарманічным адзінстве. Фаза ўпадку характарызуецца перавагай пачуццёва-матэрыяльнага над духоўна-ідэальным. І, нарэшце, заключная фаза ў развіцці пэўнай гістарычнай эпохі з пераходам да наступнага вітка гісторыі выступае як хаатычнае змяшэнне ідэальнага з матэрыяльным, духоўнага з пачуццёвым, што ў сучасным мастацтве выразна дэманструецца агульнай выродліва-эклектычнай стылістыкай эпохі, а ў філасофіі – постмадэрнізмам, які таксама ставіць хаос у аснову быцця. Усё гэта сёння можна назіраць непасрэдна, бо мы якраз пера-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жываем крызісна-пераходны перыяд.

Такім чынам, кніга змяняецца разам з агульнымі зменамі культуры ў цэлым. Адносна мастацтва агульна-гістарычная канцэпцыя цыклічнага развіцця культуры прынятая ў Беларусі з сярэдзіны шасцідзесятых гадоў [2], а ў Расійскай Федэрацыі – з дзевяностых [3]. З гэтага гледзішча наш геа-сацыяльны рэгіён перажывае заключныя фазы гістарычнага цыклу. Варта зірнуць, напрыклад, на сучасны стан некалі вялікай расійскай культуры, дзе заслужана панавала мастацкая літаратура: сёння там вядучую ролю пачынае адыгрываць усялякага роду малагустоўнае дызайнерства, суперарыгінальнае модніччанне ў культуры адзення і так званая попстылістыка.

Усё гэта адбілася і на кнізе. Кніжныя тыражы зменшыліся амаль у дзесяць разоў. Катастрафічна ўпала колькасць выданняў па філасофскай і агульнана-навуковай тэматыцы. У мастацкай літаратуры сталі панаваць забаўляльна-пацешлівыя жанры і непрыстойная тэматыка. У самой кнізе як канкрэтным прадмеце стала выяўляцца перавага формы над зместам – рыса, характэрная для таго, што П. Сарокін называе сэнсорнай культурай. Гэта выразна бачна ў знешнім кніжным афармленні, націску на колеравую яркасць і шыкоўнасць вокладкі. Кніга функцыянуе як прадмет не столькі ўжо духоўнай, колькі матэрыяльнай культуры, і таму каштоўнасць яе пачынае вызначацца не зместам а знешняй формай. Для ўспрыняцця і ацэнкі такога тыпу кнігі патрэбна ўжо не паўлаўская другая сігнальная сістэма, грунтаваная на мове і розуме, а сістэма першая, якая мае пачуццёва-жывёльны характар. Нездарма скандальна вядомы Уладзімір Сарокін увогуле вызначае мастацкую літаратуру як усяго толькі літары на паперы.

Нярэдка здараецца, аднак, што ўспрыняцце і ацэнка сацыякультурнага значэння кнігі такога стылю мае суб'ектыўна дадатны характар, трактуючыся як вынік агульнага сацыякультурнага прагрэсу толькі па гарызантальнай каардынаце часу, без уліку вертыкальнай каардынаты якасці. Замена мастацкай літаратуры мастацтвам кіно і, адпаведна, рамана яго кінаэкранізацыяй, тлумачыцца толькі пазітыўна, як вынік тэхнічнага прагрэсу. А на тое, што прагрэс засяроджваецца толькі ў сферы матэрыяльнай культуры за кошт адсоўвання ў бок патрэбаў ідэальна-духоўных, зусім не звяртаецца ўвагі. Гэтаксама перавышаецца і агульнакультурнае значэнне інтэрнету, які не ёсць яшчэ сама інфармацыя як увасабленне духоўнага зместу культуры, а толькі знешні, тэхнічна-матэрыяльны сродак яе захавання і перадачы. Таму з Маклюэнам нельга пагадзіцца, калі ён сцвярджае, што сродак якраз і ёсць сам гэты змест [4, с. 342]. З ім нельга пагадзіцца і тады, калі ён піша, што "азбука і кнігадрукаванне падтрымлівалі і заахвочвалі працэс раз'яднання, спецыялізацыі і адасаблення, электронная ж тэхніка жывіць і заахвочвае працэс аб'яднання і зблытвання" [4, с. 342]. Аднак далейшыя яго разважанні больш слушныя: "друкавальная тэхніка ствapала публіку, а электронная тэхніка стварыла масу" [4, с. 346]; "у нашай заходняй куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры рацыянальны чалавек стаў візуальным чалавекам” [4, с. 344], дзякуючы чаму “мы пачалі зноў перажываць першабытныя пачуцці і племянныя эмоцыі, ад якіх нас аддалілі некалькі стагоддзяў пісьменнасці” [4, с. 345]. Але тады ўвесь цяперашні сацыякультурны перыяд, што часам услед за Маклюэнам вызначаецца некаторымі спецыялістамі як інфармацыйная цывілізацыя ці інфармацыйнае грамадства, аўтаматычна набывае характарыстыку чагосьці прагрэсіўнага, хаця наўрад ці заслугоўвае такой ацэнкі. Гэта менавіта сэнсорная цывілізацыя, якую Піцірым Сарокін, наадварот, характызаваў як цывілізацыю глыбокага крызісу.

Найвышэйшай пазітыўнай ацэнкі можа заслугоўваць толькі цывілізацыя, якая аб’ядноўвае ў сабе і духоўную, і матэрыяльную культуры ў цэласным, гарманічным адзінстве. Пра такую гармонію чалавецтва марыла амаль з самага пачатку сваёй гісторыі, набліжаючыся часам да яе ідэалаў у славутыя Пярыклавы часы альбо ў часы знакамітага італьянскага Рэнесансу (зрэшты, і мы, беларусы, былі блізкія да тых ідэалаў у перыяд Ф. Скарыны і Вітаўта). Чалавек са сваёю духоўнаю сутнасцю, заснаванаю на мове, ніколі ад кнігі як носьбіта менавіта духоўнай культуры не адмовіцца, нягледзячы ні на якія матэрыяльна-тэхнічныя дасягненні. Кніга можа змяніць свой знешні выгляд, матэрыял альбо знешнюю форму, але сутнасць яе не зменіцца. Цяперашні стан заняпаду кнігі – толькі праяўленне крызісу культуры ў цэлым. Але наступіць час, калі наша духоўнасць адродзіцца і кніга зойме зноў сваё законнае ганаровае месца ў агульнай сістэме культуры. Сказанае, безумоўна, адносіцца і да працэсу адраджэння нашай беларускай культуры.

**Заўвагі**

1. Глядзі, напрыклад, Сидоров А. А. Книга и жизнь / А. А. Сидоров. – М., 1972; Люблинский В. С. Книга в истории человеческого общества / В. С. Люблинский. – М., 1972; Кацпржак Е. И. История книги / Кацпржак Е. И. – М., 1964; Barge H. Geschichte der Buchdruckerkunst / H. Barge. – Lpzg., 1940; Dahl S. Histoire du livre de l’antiquite a nos jours / S. Dahl. – P., 1960; McMurtris D.C. The book / D. C. McMurtris. – L., 1943; Steinberg H. Five hundred years of printing / H. Steinberg. – L., 1959.

2. Крюковский Н.И. Логика красоты / Н. И. Крюковский. – Мн., 1965; Крюковский Н.И. Основные эстетические категории (опыт систематизации) / Н. И. Крюковский. – Мн., 1994; Крюковский Н.И. Кибернетика и законы красоты / Н. И. Крюковский. – Мн., 1997; Крюковский Н.И. Homo pulcher – человек прекрасный / Н. И. Крюковский. – Мн., 1983.

3. Гл., напрыклад, Абдеев Р.Ф. Философия информационной цивилизации / Р. Ф. Абдеев. – М., 1994; Яковец Ю. В. История цивилизаций / Ю. В. Яковец. – М., 1995; Пантин В. И. Циклы и ритмы истории / В. И. Пантин. – Рязань, 1996; Цивилизация – восхождение и слом. – М., 2003; Циклические ритмы в истории, культуре, искусстве. – М., 2004.

4. Маклюэн М. Средство само есть содержание / М. Маклюэн // Информационное общество. – М., 2004. – С. 341–348.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ